**ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ**
**па правядзенні выбараў**
**у Каардынацыйную Раду ІІІ склікання**

# РАШЭННЕ

**аб адмене раней прынятага рашэння**
**аб выключэнні кандыдата са спісу выбарчага суб’екта**
**і ўнясенні зменаў у Пастанову аб зацвярджэнні спісаў выбарчых суб’ектаў**

30 красавіка 2024 года г. Варшава

Выбарчая камісія па правядзенні выбараў у Каардынацыйную раду ІІІ склікання (далей - Выбарчая камісія) ў асобах Алены Прыходзька (старшыні), Андрэя Атаманчука, Яраслава Бекіша, Дзмітрыя Лазавіка, Альвіны Мінгазавай і Алены Філатавай, разглядзеўшы ліст ад 30 красавіка 2024 года ад кандыдата выбрачага спісу “Еўрапейскі выбар” Аліны Коўшык (Коўшык-Петшыкоўскай),

**ВЫЗНАЧЫЛА:**

22 красавіка 2024 года ў Выбарчую камісію паступіла заяўка на рэгістрацыю выбарчага суб’екта “Еўрапейскі выбар” ад Аляксандра Дабравольскага. Сярод кандыдатаў у спісе была адзначана “Аліна Коўшык”. У той жа дзень ініцыятару спіса быў дадзены адказ аб прыёме заяўкі, у якім паведамлялася, што па выніку апрацоўкі заяўкі будзе дасланы верыфікацыйны код, пасля чаго цягам 48 гадзін будзе праводзіцца верыфікацыя кожнага чальца выбарчага спісу.

23 красавіка 2024 года у 11 гадзін 10 хвілін (CET) па выніку апрацоўкі Сакратарыятам Выбарчай камісіі пададзенай заяўкі, на адрас лідара спіса Аляксандра Дабравольскага паступіў код індывідуальнага ідэнтыфікатару выбарчага спіса. У лісце таксама ўтрымлівалася спасылка на форму рэгістрацыі для кандыдатаў выбарчага спісу і просьба прайсці верыфікацыю цягам 48 гадзін. У форме верыфікацыі чальца выбарчага спіса ўказваўся апошні тэрмін падачы заявак - 25 красавіка 2024 года 11:04 па мінскім часе (12:04 па CET).

23 красавіка 2024 года паступіла заяўка ад імені Аліны Коўшык, да якой быў далучаны ідэнтыфікацыйны дакумент - пашпарт Рэспублікі Беларусь на імя ALINA KOUSHYK-PIETRZYKOWSKA.

З прычыны несупадзення пазначанага ў заяўках прозвішча з ідэнтыфікацыйнымі дадзенымі кандыдата (паводле пашпарта), 24 красавіка 2024 года на адрас лідара спісу выбарчага суб’екта Аляксандра Дабравольскага быў

накіраваны ліст, у якім утрымліваўся просьба падаць у Выбарчую камісію наступныя дадзеныя пра заяўніка:

1. *Імя і прозвішча кандыдата згодна з дакументам, які ідэнтыфікуе грамадзянства Рэспублікі Беларусь;*
2. *Імя і прозвішча кандыдата, якое яна жадае ўказаць у спісе кандыдатаў побач з указаным у п.1;*
3. *абгрунтаванне неабходнасці ўказання ў спісе выбарчага суб'екта імя і прозвішча, якое адрозніваецца ад указанага ў п.1 (пры неабходнасці з прыкладаннем дакументаў).*

У 24:00 (CET) ініцыятар выбарчага спісу адказаў на электронны адрас Выбарчай камісіі, што заяўнік гатовая “прадставіць усе дакументы і тлумачэнні”.

25 красавіка 2024 года а 12-й гадзіне (па CET) пачалося адкрытае пасяджэнне Выбарчай камісіі, на якім было агучана рашэнне па рэгістрацыі і далейшым удзеле 12-ці выбарчых спісаў (у тым ліку “Еўрапейскі выбар”). Да пачатку пасяджэння ў Выбарчую камісію так і не паступілі наступныя звесткі ад заяўніка:

1) напісанне імя і прозвішча (згодна з пашпартам),

2) напісанне імя і прозвішча (якое кандыдат жадае ўказаць у спісе),

3) абгрунтаванне.

Не маючы гэтых дадзеных, Выбарчая камісія прыняла рашэнне аб выключэнні са спісу кандыдатаў Аліну Коўшык.

25 красавіка 2024 года ў 12:05 (CET) падчас публічнага пасяджэння Выбарча камісіі ад кандыдата паступіў наступны ліст:

*“Шаноўныя сябры выбарчай камісіі,*

*Прашу ўказаць у спісе прозвішча Коўшык, другая частка прозвішча - майго было мужа, пастанову пра развод прыкладаю. Тэхнічнай магчымасці замяніць прозвішча ў беларускіх дакументах зараз няма. Прашу таксама ўлічыць факт, што публічна я зашседы выкарыстоўвала прозвішча Коўшык і яно не адрозніваецца ад паданага ў дакументах (акрамя другой часткі прозвішча)”.*

Гэты ліст не быў прадметам разгляду на пасяджэнні Выбарчай камісіі, паколькі быў паслана пасля пачатку пасяджэння. Акрамя таго, Выбарчая камісія не атрымала адказы па раней накіраваных пытаннях аб указанні ў спісе анкетных дадзеных.

29 красавіка 2024 года ад кандыдата паступіў адказ на ліст Выбарчай камісіі ад 23 красавіка 2024 года (аб падачы анкетных дадзеных і абгрунтавання). Кандыдат напісала наступнае:

*“У адказ на ліст выбарчай камісіі паведамляю:*
*1 мае імя ў пашпарце РБ Аліна Коўшык-Петшыкоўска*
*2 у спісе прашу ўказаць толькі Аліна Коўшык.*

*У маёй скарзе, якую даслала 26 красавіка, я зазначыла просьбу фігураваць у спісе пад маім сапраўдныя дзявочым прозвішчам. Лічу, што прадстаўленыя дакументы і тлумачэнні даюць магчымасць верыфікаваць маю асобу і даць мне магчымасць удзельнічаць у выбарчым працэсе. Спадзяюся на добрую волю камісіі паспрыяць інклюзіўнаму выбарчаму працэсу”.*

29 красавіка 2024 года на адкрытым пасяджэнні Камісіі была разгледжана скарга кандыдата ад 26 красавіка 2024 года і прынята рашэнне аб адмове ў яе здавальненні.

29 красавіка на адрас кандыдата быў дасланы ліст наступнага зместу:

*“Паважаная спадарыня Аліна!*

*Выбарчая камісія атрымала ад Вас запатрабаваныя анкетныя дадзеныя.*

*У звароце ад 29 красавіка 2024 года Вы просіце не пазначаць Вашае прозвішча "Коўшык-Петшыкоўска" ў спісе кандыдатаў выбарчага суб'екта "Еўрапейскі выбар".*

*Разгледзіўшы гэтую просьбу, Выбарчая камісія не знайшла магчымым яе здаволіць. Працэдура і парадак пазначэння асобы ў спісе кандыдатаў выбарчага суб'екта была вызначана Выбарчай камісіяй і з'яўляецца аднолькавай для ўсіх. Асаблівых акалічнасцяў, якія б дазволілі не пазначаць Вашае прозвішча ў спісе, Выбарчай камісіяй не выяўлена.*

*З гэтай прычыны прапануем даць згоду на ўключэнне Вашай кандыдатуры ў спіс наступным чынам:*

*"2. Аліна Коўшык (Коўшык-Петшыкоўска)"”*

30 красавіка 2024 года ад кандыдата выбрачага спісу “Еўрапейскі выбар” Аліны Коўшык (Коўшык-Петшыкоўска) паступіў адказ наступнага зместу:

*“Шаноўная камісія,*

*Дзякуй за Ваш адказ. Я разумею, што парадак уключэння асобы ў спіс кандыдатаў вызначаецца выключна стандартамі, устаноўленымі Выбарчай камісіяй, якая не гатовая да інклюзіўнасці і прыняцця іншых варыянтаў. У звязку з гэтым, даю згоду на ўключэнне маёй кандыдатуры ў спіс па прапанаваным Вам чынам:*

*"2. Аліна Коўшык (Коўшык-Петшыкоўска)".*

Абмеркаваўшы акалічнасці справы, Выбарчая камісія прыходзіць да высновы, што кандыдатам цалкам выкананы патрабаванні Палажэння, верыфікацыя праведзена паспяхова, дадзеныя кандыдата супадаюць з дасланым ідэнтыфікацыйным дакументам.

Паколькі Палажэнне не прадугледжвае абавязковых тэрмінаў верыфікацыі кандыдатаў спісаў выбарчых суб’ектаў, а спіс выбарчага суб’екта “Еўрапейскі выбар” з кандыдатам прайшоў рэгістрацыю рашэннем ад 23 красавіка 2024 года №24/04/23-4, Камісія прыходзіць да высновы, што кандыдат можа быць дапушчаны да выбараў.

На падставе вышэй выкладзенага, кіруючыся Палажэннем аб выбарах у Каардынацыйную раду, Выбарчая камісія

**ВЫРАШЫЛА:**

Рашэнне аб выключэнні кандыдата Аліны Коўшык (Коўшык-Петшыкоўскай) са спіса кандыдатаў выбарчага суб’екта “Еўрапейскі выбар” - адмяніць у сувязі са скасаваннем перашкодаў для зацвярджэння кандыдата ў выбарчым спісе.

Унесці ў Пастанову аб зацвярджэнні спісаў выбарчых суб’ектаў ад 25 красавіка 2024 года наступныя змены: спіс кандыдатаў выбарчага суб'екта "Еўрапейскі выбар" дапоўніць кандыдатам Алінай Коўшык (Коўшык-Петшыкоўскай) пад нумарам 2; спіс кандыдатаў прывесці ў адпаведнасць з патрабаваннямі Палажэння аб выбарах у Каардынацыйную раду ад 31 сакавіка 2024 года.

Старшыня Выбарчай камісіі А. Прыходзька